

# «Раней ад прышчэпак адмаўляліся»

### Бясплатная вакцына і 5000 шпрыцаў

Вёска Задвор'е. На вуліцы спыняецца аўто з надпісам «ветдапамога». Двое ўрачоў пачынаюць абыходзіць дамы. Прышчэпкі для прафілактыкі робяць катам і сабакам. Кароў, свіней не чапаюць — у іх кантакту з драпежнікам не магло быць.

— Для вакцынацыі закупілі пяць тысяч аднаразовых шпрыцаў, — кажа **Аляксандр БРАЎКО, намеснік галоўнага ветурача раёна па хваробах сельскагаспадарчых жывёл,** і паказвае, што яшчэ ляжыць у яго жалезнай скрынцы — ватныя тампоны і спірт для асэптыкі.





Намеснік галоўнага ветурача раёна Аляксандр БРАЎКО пазначае, гадаванцаў з якіх дамоў ахапілі вакцынацыяй.

— Мінулыя гады, калі па вёсках хадзілі, чулі ад жыхароў: «Чаго вы хочаце? Майму сабаку прышчэпка не патрэбна, ён нікуды не бегае». А цяпер пагаджаюцца. «Гэта нарэшце воўка?» — удакладняюць. Адказваем, што так, і адразу папярэджваем — прышчэпка бясплатная, — дадае **вядучы ветэрынарны ўрач-эпізаатолаг Генадзь МАРКОЎСКІ.**

Вакцынацыі пазбягаюць толькі ўжо прышчэпленыя гадаванцы з пашпартамі (але такіх мала) і тыя, хто пакуль на лячэнні (напрыклад, пасля пераламу лапы).

За брамкай з папярэджаннем «Асцярожна, злы сабака» брэша кудлаты вартаўнік. З дома паказваецца мужчына. Пачуўшы аб прышчэпцы, просіць пачакаць:

— Зараз сына паклічу, ён з сабакам больш сябруе.

Праўда, хлопец таксама губляецца: гадаванец немаленькі, з характарам, як яго ўтрымаць?

— Бярэш за поўсць каля шыі, вось так, заціскаеш паміж ног, — інструктуюць ветэрынары і за секунду робяць укол. Жывёла пакрыўджана збягае, а гаспадар расказвае, што навіна пра воўка яго асабліва не спужала, дадатковых мер бяспекі не прадпрымаў — сабака ж за брамку не выходзіць, толькі ў двары бегае.

— А хто такіх прышчэпліваць будзе? — ківае мужчына на хаты цераз дарогу. — Гаспадары ў Мінску жывуць, толькі на выхадныя прыязджаюць.

— Ім трэба будзе самім на ветстанцыю жывёл прывезці. Перадайце, як убачыце.

У іншым доме дзверы адчыняе жанчына.

— Я ў бальніцы на перавязцы была, не ведаю, дзе кот. Віскі, Віскі!

На яе голас з агародаў прыбягае чорны кот, праціскаецца ў дом і ўсаджваецца на падаконніку.

— Вы яго патрымаеце?

А то я баюся, — прызнаецца жанчына.

Пакуль ветэрынары праводзяць неабходную працэдуру, гаспадыня дзеліцца: у першыя дні пасля здарэння з воўкам у краму не выходзіла — усё ж такі лес ад вёскі блізка.

Па дарозе ўрачы ўспамінаюць: апошні выпадак шаленства ў воўка быў зарэгістраваны ажно ў 1982 годзе, у вёсцы Найдзёнавічы. Куды часцей сустракаюцца хворыя лісы (хоць неяк разносчыкам быў і янот).

— Вунь дом агароджаны сеткай-рабіцай: ліса праз яе лёгка пераlazіць, як па лесвіцы. Быў выпадак — ліса забралася ў вальер да аўчаркі. Вядома, тая разарвала яе. Гаспадары своечасова не звярнуліся. А калі ўжо змяніліся паводзіны сабакі, прызналіся, што ён ліcу загрыз. Тады зрабілі эўтаназію. Адправілі на даследаванне мозг гэтага сабакі — сапраўды, пацвердзілася шаленства.

Непрышчэпленых гадаванцаў, што былі ў кантакце з хворай жывёлай, часам прапануюць усыпіць. Медыкі ўздыхаюць: вядома, гэта самы жорсткі метад, але надзейны.

— Вакцына стапрацэнтнай гарантыі даць не можа, — тлумачаць. — Пасля прышчэпкі павінна прайсці не менш за 14 дзён, каб выпрацаваўся імунітэт. А зімой гэты тэрмін можа падоўжыцца да двух месяцаў — чаму і каранцін на такі перыяд.



### Падазроных жывёл няма

Стоўбцы. У гарадской ветклініцы даволі ціха.

— А ўчора было не прысесці! Больш за 100 чалавек звярнуліся. Прышчапілі 62 каты і 43 сабакі, — заўважае **загадчык ветклінікі Вадзім ТАМАШЭВІЧ.**

У гэтыя дні ўстанова працуе без выхадных, з васьмі раніцы да васьмі вечара. Самы загружаны час — пасля 17 гадзін. Раніцай прыходзяць у асноўным пенсіянеры. Прычым хапае і тых, хто едзе з вёсак. Некаторым уколы даюць з сабой — напрыклад, бабулям, якія не могуць прывезці вялікага сабаку, што сядзіць на ланцугу.

Усяго па стане на чацвер у раёне за гэтыя некалькі дзён прышчапілі 368 катоў і 283 сабакі.

Хоць здарэнне было амаль тыдзень таму, мясцовыя жыхары абмяркоўваюць яго і дагэтуль. Кажуць, за адной з пацярпелых жанчын воўк літаральна гнаўся. Упала б — загрыз бы...

— У нас расказваюць, што воўк яшчэ на некага накінуўся, на кавалкі парваў, — перадавала чуткі (на шчасце, непацверджаныя) адна з гаспадынь, пакуль ветэрынары прышчэплівалі катоў на яе падворку.

Мясцовым жыхарам рэкамендуюць пакуль сачыць за гадаванцамі: ці п'е ваду, ці не паводзіць сябе занадта агрэсіўна або наадварот ласкава, ці не павысілася сліназцячэнне. Але, запэўніваюць на ветстанцыі, падчас абходу падворкаў у горадзе і вёсках падазроных жывёл не было.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*Стаўбцоўскі раён.*

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


БЕЛАРУСБАНК

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже изолированного помещения**

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – ОАО «АСБ Беларусбанк».

Наименование объекта продажи: изолированное помещение (назначение – административно-торговое помещение) общей площадью 580,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Пимена Панченко, 60–136.



ОАО «АСБ Беларусбанк» принадлежит доля в праве на земельный участок с кадастровым номером 500000000006006949 для эксплуатации и обслуживания здания многоквартирного жилого дома со встроенными нежилыми помещениями (право аренды).

Начальная цена продажи составляет 815 040,00 (восемьсот пятнадцать тысяч сорок рублей 0 копеек) с учетом НДС.

Сумма задатка – 8 150,40 (восемь тысяч сто пятьдесят рублей 40 копеек).

Открытый аукцион состоится 05.03.2019 в 10.00 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 18, комната переговоров (помещение на первом этаже).

Заявление на участие принимается в рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45 по 04.03.2019 включительно по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 18, кабинет 338, тел.: (017) 309 05 43, (029) 632 06 83.

Продавец – ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается и регистрируется в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

По вопросам, связанным с организацией осмотра объекта продажи, обращаться по телефонам: (017) 309 06 60, (029) 145 13 87 – Баек Павел Александрович.

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка по 04.03.2019 включительно на счет № BY66AKBB66708599005400000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 20 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона



**Ликвидационная комиссия РУПП «Гродготекстиль» объявляет о проведении повторного аукциона по продаже имущества**

| № п/п | Наименование имущества | Стоимость с НДС | Сумма задатка 10 % |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Водопроводная сеть, 22,24 м, инвентарный № 400/С-72656 (сооружение специализированное коммунального хозяйства) | 66,00 | 6,60 |
| | Канализационная сеть, 129,1 м, инвентарный № 400/С-72659 (сооружение специализированное коммунального хозяйства) | 192,55 | 19,26 |
| Лот № 2 | Кабельная линия 0,4 кВт, 83,5 м, инвентарный № 400/С-72680 (сооружение специализированное энергетики) | 27,66 | 2,77 |

Имущество находится по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Богуцкого, 8. Торги состоятся 15 февраля 2019 года в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. Горького,121. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

– копия платежного поручения о внесении на счет РУПП «Гродготекстиль» № BY32BLBB30120500048503001001, БИК BLBBBY2X в ОАО «Белинвестбанк» г. Гродно, УНП 500048503, суммы задатка по каждому лоту;

– копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица (индивидуального предпринимателя).

Документы должны быть представлены до 15.00 12 февраля 2019 года. Победитель аукциона возмещает затраты по организации и проведению аукциона. Телефон для справок (8 152) 43-99-64